**Шостак, Я.** «Гэта была мірная вайна…» / Я. Шостак // Герой працы (Шуміліна). — 2002. — 15 лют. — С. 1—2.

## «ГЭТА БЫЛА МИРНАЯ ВАЙНА…»



Не думаў Алег Куценка, што давядзецца ваяваць у мірны час. Пасля школы падаўся ў Лужаснянскі сельгастэхнікум, абраў сабе мірную прафесію агранома. Хацелася прысвяціць сябе земляробству, застацца ў сельскай гаспадарцы, як і яго бацькі, якія ўсё жыццё пражылі ў вёсцы Пятніцкія Каўлякоўскага сельскага Савета.

Закончыў тэхнікум і па размеркаванні мог трапіць у Дубровенскі раён. Але прыспела вайсковая служба. Прызываўся 4 мая 87-га (дату помніць – яна не забываецца). Прызываўся з Віцебска. Ведаў, што там, у далёкіх гарах Афгана, яго землякі ўжо каторы год вялі зацятыя баі з душманамі. Пра гэта гаварылі па радыё, пісалі газеты. А калі сказалі Алегу, што вылятае разам з іншымі равеснікамі ў далёкую Фергану, стала ясна: Афганістана не мінаваць. Трывогі ці нейкага страху не было: усё, што дзеелася там, на вайне, было яшчэ далёкім і нязведаным.

Вучэбка на шэсць месяцаў, калі юнакоў грунтоўна і карпатліва вучылі сапёрнай справе, і, нарэшце, Алег у Кабуле.

– Гэта была мінная вайна, – згадвае Алег Мікалаевіч Куценка, цяпер участковы РАУС, старшы лейтэнант міліцыі. – Фронту не было, мы не бачылі перад сабой рэгулярных войскаў праціўніка. Але лягчэй ад гэтага не было...

Алег трапіў у сапёрны батальён, і мінёры разам з разведчыкамі «вадзілі» савецкую тэхніку па гарах, былі ў адказе за бяспеку калоны. Давялося сядзець і ў засадах, весці размініраванне, самому ставіць міны, каб паралізаваць ворага.

– Вораг быў хітры і бязлітасны. Для іх горы, як вада для рыбы. Мы ж такой спякоты і сухмені ў Беларусі не бачылі.

Але прыстасоўвацца трэба было, інакш не выжывеш, а гінуць маладому юнаку не хацелася.

Размясціліся ля аэрадрома, які кожную ноч бамбілі душманы, даставалася, вядома, і сапёрам-пехацінцам. Днём было звычайна ціха, а ноччу ворагі спаць не давалі. Было неспакойна, было трывожна, але толькі першыя месяцы, затым прывыкаеш. І да абстрэлу, і да паходаў па гарах, калі з сапёрным шчупам ідзеш уперадзе разведчыкаў, намацваеш кожную пядзю зямлі. Памылкі былі, узрываліся савецкія воіны, але да яго, Алегавага, прызыву.

– Дзякуй Богу, мяне такое ліха мінула, – скупа ўсміхаецца суразмоўца. – Але ўсё роўна пакуль пройдзеш ад заставы да заставы – пот градам. Ад хвалявання. А яшчэ – цягнеш на плячах цяжкую амуніцыю: і аўтамат; і шчуп, і траціл. Затое вучыліся вынослівасці. Мірных людзей мы не чапалі, а гавораць, што мы захопнікі. Якія ж мы захопнікі, якія акупанты? Мы забяспечвалі прадуктамі заставы, вазілі паліва, перадыслацыравалі сваіх салдат.

Узнагароджваюць на вайне не ўсіх. Аднак колькі ні размаўляеш з афганцамі, мала ад каго даб'ешся яркага эпізоду, за які атрыманы медаль ці ордэн. Алег акуратна, з усёй адказнасцю вёў сваю справу сапёра, не памыляўся. А гэта на вайне нямала, можа, гэта якраз і ёсць тая мужнасць

салдат афганскай вайны. Таму на грудзях у Алегаззяе медаль «За баявыя заслугі», а калі зноў стаў цывільным, вярнуўся са службы на радзіму, знайшла яго і другая больш важкая узнагарода, медяль «За адвагу».

Служыў у арміі роўна два гады, якраз 4 мая 89-га вярнуўся дамоў. Прывабіў горад, хто ведае, калі б не Віцебск, мо і не знайшоў бы сабе такую прыгожую дзяўчыну, як Таццяна. Стварылі сваю сям'ю, а пасля зразумелі, што гарадское жыццё – не для іх. Вярнуліся на Шуміліншчыну. Вырашыў пайсці ў міліцыю. Спачатку быў участковым у Обалі, а пасля перавялі яго ў Шуміліна... Згадвае Алег Куценка свой Афган, ведае, з якой трывогай і нецярпеннем чакалі ад яго ў Пятніцкіх кожнай вестачкі, як перачытвалі кожнае слова, як плакала ўпотай маці, маліла Бога за, яго, меншага сына, – і ўсё гэта цяжкім грузам кладзецца на сэрца. Не хоча Алег, каб такі ж лёс напаткаў яго сына Дзімку. Вайна – ёсць вайна: яна шчасця нікому не нясе. Але яна пражыта, і гэтыя гады не хочацца выкідваць Алегу Куценку са сваёй біяграфіі. Ён годна выконваў свой інтэрнаідыянальны абавязак – быў салдатам, сапёрам, мужчынам, які па-сапраўднаму цэніць салдацкую дружбу, ведае цану кожнаму пражытаму дню на вайне.

**Я. Шостак**